Вербы – святочны атрыбут, зроблены з душой

Аўтар: Кінга Красіцкая
09.04.2017 00:00



У Пальмовую нядзелю вернікі збіраюцца на ўспамін трыумфальнага ўваходу Хрыста ў Іерусалім і, згодна з традыцыяй, ідуць вулічнай працэсіяй.

Вербніца для католікаў – адна з найважнейшых і найбольш любімых урачыстасцей, якая не толькі адкрывае выключны час Вялікага тыдня, але таксама атаясамліваецца з духоўным драджэннем і, перш за ўсё, з пальмамі – сімвалам уваскрасення і неўміручасці чалавечай душы. Майстрыхі Дамінікаўны

Менавіта так па-сяброўску клічуць 4-ох сясцёр – Дамініку, Ванду, Дануту і Чаславу (у дзявоцтве Сарасек), якія з'яўляюцца носьбітамі рамяства стварэння велікодных вербаў. Сёння без іх пальм – сапраўднага твора мастацтва – не абыходзіцца ніводная Вербная нядзеля ў Гродне. † **“Творчы фундамент у нас, напэўна, заклалі бацькі, якія былі добрымі рамеснікамі,** – гаворыць Дамініка Дамінікаўна. – **Тата мог пашыць абутак, скаваць нешта з жалеза, а мама вельмі добра шыла і ткала дываны. Бацькам даводзілася цяжка працаваць, бо мелі вялікую гаспадарку. Ды і нас, дзяцей, трэба было выхоўваць. Але, нягледзячы на гэта, мама знаходзіла час, каб пасадзіць каля дома кветкі. Мы разам за імі даглядалі. Адсюль, хіба, і пачалося наша захапленне фларыстыкай”.**

Дамініка Дамінікаўна ўзгадвае, што раней галінкі вярбы проста перавязвалі ніткамі. Пазней пачалі ўпрыгожваць барвінкам, аспарагусам, ядлоўцам. Затым у якасці дэкора сталі выкарыстоўваць папяровыя кветкі. **“Яшчэ ў савецкія часы я пачала ствараць самыя разнастайныя варыянты ўпрыгожання вярбовых галінак. Але гэта быў перыяд атэізму, калі праследавалі за веру. Таму нельга было выйсці на вуліцу і паказаць шырокаму колу людзей велікодныя пальмы, аздобленыя каляровымі засушанымі кветкамі і травамі** , – дзеліцца ўспамінамі жанчына. –

Калі пачалася «адліга», прыгожыя вербы паступова здабылі папулярнасць.

Да цікавай справы далучыліся мае сёстры. Кожная стала прапаноўваць свае варыянты ўпрыгожання, прыдумляць цікавыя элементы. Дзякуючы фантазіі і творчаму падыходу велікодныя пальмы зрабіліся нашай візітоўкай.

Аўтар: Кінга Красіцкая
09.04.2017 00:00

З тых часоў мы не страцілі энтузіязму, з якім узяліся некалі за справу. Наадварот, з гадамі захапіліся яшчэ больш”.

Каб аздобіць вярбу, трэба працаваць увесь год



Створаныя велікодныя вербы па сваёй форме нагадваюць лісце паўднёвай пальмы, якім высцілалі шлях Хрыста падчас Яго ўваходу ў Іерусалім. Прамы ствол з пышнай верхавінай з’яўляецца сімвалам узыходжання і адраджэння, а праз рознакаляровасць перадаецца сутнасць райскіх вобразаў.

“Нашы вербы часта параўноўваюць з «віленскімі», якія папулярныя ў Літве і Польшчы , – адзначае Дамініка Дамінікаўна. – **Але ў іх ёсць прынцыповае адрозненне: «віленскія» нагадваюць сапраўдныя букеты, «гродзенскія» – не аб’ёмныя. Маюць плоскую форму, якая прадыктавана традыцыяй захоўваць вербы за абразамі”** .

Майстрыха падкрэслівае, што неад’емны элемент “гродзенскай” пальмы – гэта 3 галінкі вярбы вышынёй каля 50-ці см, якія сімвалізуюць Святую Тройцу. Менавіта яны з’яўляюцца асновай, якая пазней упрыгожваецца. **“Кампазіцыі могуць быць самымі рознымі, усё залежыць ад фантазіі і настрою** , – гаворыць Дамініка Дамінікаўна. – **Я ўпрыгожваю вярбу сухавейкамі, жытнімі і аўсянымі каласкамі, барвінкам, ядлоўцам, галінкамі самшыту, цімафееўкай, мятлікам, рознымі зёлкамі і травамі, якія збіраю на лугах, палях, у лесе. Таксама выкарыстоўваю кукурузнае лісце, з якога раблю рознакаляровыя кветкі”** .

Жанчына распавядае, што каб упрыгожыць вярбу, трэба быць не толькі добрым фларыстам, але батанікам і нават хімікам: **“На сваім лецішчы я адмыслова вырошчваю сухавейкі. Пасля з дапамогай анілінавых фарбавальнікаў надаю ім розныя колеры: чырвоны, жоўты, аранжавы, фіялетавы, зялёны. Ды і з тымі раслінамі, каторыя збіраю ў дзікай прыродзе, не ўсё проста. Трэба ведаць, калі найлепш іх збіраць, як сушыць, у якіх умовах захоўваць. Нарыхтоўка матэрыялу забірае шмат часу. Вось і атрымліваецца, што ўпрыгожыць вярбовыя галінкі можна за гадзіну, а рыхтаваць для гэтага матэрыялы трэба ледзь не цэлы год”.**

Рамяство не для бізнесу, а для душы

Вербы – святочны атрыбут, зроблены з душой

Аўтар: Кінга Красіцкая
09.04.2017 00:00

